**ДУА “Мсціжская сярэдняя школа Барысаўскага раёна”**
*Тэма*: **Раздзяляльны мяккі знак (ь) і апостраф (’) (2 клас)**
***Дата:*** 13.02.2024
***Настаўнік:*** Матрашыла Іна Сямёнаўна, першая катэгорыя
*Мэты*:

- фарміраваць уменне правільна вымаўляць і пісаць словы з раздзяляльным мяккім знакам і апострафам;
- тлумачыць правапіс слоў;
- развіваць уменне ажыццяўляць групоўку слоў па самастойна вызначанай прымеце;
- выпрацоўваць уменне пісаць пад дыктоўку, ажыццяўляць узаемаправерку;
- узбагачаць слоўнікавы запас фразеалагізмамі;
- развіваць звязнае вуснае маўленне;
- выхоўваць клапатлівыя адносіны да птушак.

**Вучэбна-метадычнае забеспячэнне:** навучальны дапаможнік Н.М.Антановіч, Н.У.Антонава“Беларуская мова”. Ч. 2: урок 25; карткі, табліцы; ілюстрацыі да фразеалагізмаў.

**Ход урока**

***1. Арганізацыйны момант***

- Мы дружныя і працавітыя, будзем добра працаваць. падтрымліваць адзін аднаго. Зараз успомнім і нагадаем наш дэвіз: «Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго!».

***2. Праверка дамашнягазадання***

Вучні чытаюць прыказкі, тлумачаць іх сэнс , напісанне устаўленых літар і знакаў.
- Пра якое права ўпамінаецца ў апошняй прыказцы. (Права на сям’ю)

***3. Актуалізацыяведаў***

**Гульня «Вострае вока».**
- На дошцы запісаны словы. Вам патрэбна ўставіць прапушчаныя літары і растлумачыць правапіс.

*С..бры, б..розка, хола.., маро.., кры..е, насе..е, паштал..ён, аб..ява.*

***4. Хвілінка чыстапісання***

Прапішыце знакі і словы.
*' ', ь*
*лье, мільён, медальён, вераб’і*
- Якое слова лішняе? Чаму?
- Вы ўсепамятаеце, штоапострафгэта не літара, а надрадковы знак.
- Якую работу выконваеапостраф, мяккі знак?

***5. Паведамленне тэмы ўрока і пастаноўка мэты.***

***6. Работа па падручніку.***

Практ 56. (На дошцы размешчаны надрукаваныя словы. Вучні размяркоўваюць словы па групах)
Робіцца вывад, калі не пішацца апостраф.
Азнаямленне з інфармацыяй на стар. 41.

***7.Замацаванне ведаў***

Разгадванне крыжаванкі, складзенай на аснове матэрыялу практ. 57.

1) Зброя старажытных воінаў.
2) Вопратка птушак.
3) Стан атмасферы ў пэўны час у пэўным месцы.

4) Група зорак на небе.
5) Гутарка з карэспандэнтам па пытаннях.
6) Перагародка, якой аддзяляецца што-небудзь ад чаго – небудзь.
7) Уваход у будынак.

( Ключавое слова – апостраф). Падагульненне правіла напісання апострафа.

**Фізкультхвілінка.**

*Сонейкапускае свае вясёлыяпромні.(Імітацыя рухаў.)*
*Вецер гойдае галінкі дрэў.(Рукі ўгору, нахілы ўлева, управа.)*
*На рэчцы крыгаход. Ідзе дожджык.(Імітацыя рухаў.)*
*У небе зайгралавясёлка.(Скачкі.)*
*Ветрыкпатыхае.(Махірукаміперадтварам.)*
*Птушкіляцяць з выраю.(Імітацыярухаў.)*
*Паўзевусень.(Імітацыярухаў.)*
*Птушанятыпросяцьесці.(Адкрыць рот і паварочвацьгалаву.)*

***8. Праца з фразеалагізмамі***

Настаўнік прапаноўвае малюнкі і просіць з практ. 58 падабраць адпаведныя фразеалагізмы, патлумачыць сэнс, уставіць прапушчаныя літары. Вучні дапаўняюць патрэбным фразеалагізмам сказ і падкрэсліваюць устаўленую літару.

***9. Развіццё вуснай мовы.***

Настаўнік прапануе, скласці невялікае апавяданне пра жыцце птушак зімой  на аснове ўласных назіранняў.(Выказванні дзяцей)

***10. Кантроль і прымяненне ведаў на практыцы***

Работа з практ. 59. Дзеці працуюць самастойна і па варыянтах. 1 в-т –першы сказ,
2 в-т- 2 сказ.

Настаўнік загадзя піша правільна  словы. Пасля выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка па ўзоры запісаным на адваротным баку дошкі.

***11. Этап інфармавання аб дамашнім заданні***

Практ. 60, стар.43. дапоўніць лічылку патрэбнымі словамі. Спісаць і падкрэсліць літары, паміж якімі стаіць апостраф.

***12. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія***

**Гульня «Так ці не».**

- *Апостраф пішацца пасля галосных.*
- *Апостраф пішацца пасля зычных перад галоснымі.*
- *Апостраф пішацца пасля літар, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі, перад літарамі* е, ё, ю, я, і.
- *Раздзяляльны мяккі знак абазначае мяккасць папярэдняга зычнага.*
- *Літары у, я, ё, ю абазначаюцца двума гукамі перад мяккім знакам.*
- *Пасля ў апостраф пішацца.*

Ацэньванне настаўнікам

Малайцы! Дзякуйусім за плённую працу на ўроку!